# «КАЛОЖСКІ БЛАГАВЕСТ»: ПАЯДНАНЫЯ СЛОВАМ І МУЗЫКАЙ

**45 калектываў з васьмі краін прыехалі ў Гродна, каб паўдзельнічаць у традыцыйным, ужо дванаццатым міжнародным фестывалі праваслаўных песнапенняў «Каложскі благавест».**



Сёлетні фестываль, як звычайна, праходзіў у два этапы. На першым, у перыяд калядных свят, выступалі прыходскія хоры Гродзенскай епархіі, а на другім геаграфія ўдзельнікаў значна пашырылася. Гэтым разам да хароў і ансамбляў з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Румыніі, Сербіі першыню далучыўся калектыў з Францыі — хор Свята-Аляксандра-Неўскага кафедральнага сабора ў Парыжы. Аб папулярнасці праваслаўных песнапенняў не толькі ў нашай краіне, але і ў замежжы сведчыць тое, што далёка не ўсім ахвотным пашчасціла трапіць сёлета на фестываль у горадзе над Нёманам. Шэраг калектываў, якія даслалі заяўкі пазней за іншых, уключаны ў спіс удзельнікаў на наступны год.

Старшыня журы фестывалю Андрэй Бандарэнка адзначае, што сваё майстэрства разам паказваюць розныя калектывы — царкоўныя і свецкія, прафесійныя і аматарскія. А член журы з Украіны Іван Тараненка лічыць вельмі важным, што прадстаўлены самыя розныя стылі выканання праваслаўных песнапенняў.

Дарэчы, да фестывалю ў Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі падрыхтавалі выставу кніг і абразоў «Дзіўны Бог у святых сваіх» (*на здымку*). А ў абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Карскага арганізавалі выставу нотных матэрыялаў, гуказапісаў і кніг «Сіла духоўнага песнапення».

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.**